УДК 811.161.3

**А. В. Доўгаль, Д. А. Доўгаль**
**Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”, кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі**

# ВЫКАРЫСТАННЕ РЭСУРСАЎ САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТАК ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ШКОЛЬНІКАЎ ДА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

В статье описывается опыт применения ресурсов социальной сети “ВКонтакте” при подготовке школьников к заключительному этапу республиканской олимпиады по белорусскому языку и литературе.

The article highlights the experience in applying resources of ‘VKontakte’ social network in preparing schoolchildren for the finals of the Republican Olympiad in Belarusian language and literature.

*Ключевые слова:* социальная сеть, группа, участники группы, аккаунт, предметная олимпиада, учебно-тренировочные сборы, белорусский язык, белорусская литература.

*Key words:* social network, group, group participants, account, subject olympiad, educational training sessions, Belarusian language, Belarusian literature.

З мэтай выяўлення і развіцця адораных і высокаматываваных навучэнцаў, рэалізацыі іх патэнцыйных магчымасцей штогод праводзяцца разнастайныя мерапрыемствы, сярод якіх цэнтральнае месца займаюць рэспубліканскія алімпіяды па вучэбных прадметах. Педагогі, якія займаюцца з такімі школьнікамі, знаходзяцца ў пошуку эфектыўных шляхоў і сродкаў падрыхтоўкі да гэтага інтэлектуальнага спаборніцтва. Нам ужо даводзілася, акрэсліваючы значэнне вучэбна-трэніровачных збораў у сістэме падрыхтоўкі да заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па мове і літаратуры [1], звяртацца да ролі сацыяльных сетак у наладжванні адукацыйнага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі алімпіяды і педагогамі. У дадзеным артыкуле спынімся больш падрабязна на яго асобных аспектах.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сацыяльная сетка – гэта інтэрактыўны вэб-сайт, які дае магчымасць шматлікім карыстальнікам, аб’яднаным агульнымі інтарэсамі, камунікаваць у спецыяльна створаным сацыяльным асяроддзі. Адной з сетак, якой актыўна карыстаюцца беларусы, з’яўляецца “ВКонтакте” (vk.ru). Асабліва папулярны гэты рэсурс сярод вучнёўскай і студэнцкай моладзі. У пацвярджэнне адзначым, што амаль усе ўдзельнікі заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры ад Магілёўскай вобласці на момант пачатку падрыхтоўкі ўжо мелі свае старонкі (акаўнты). Для арганізацыі вучэбнага ўзаемадзеяння з удзельнікамі вучэбна-трэніровачных збораў мы выкарысталі такую платформу сацыяльнай сеткі, як група, або суполка. У 2015–2017 гадах трэнерам абласной каманды для абмену інфармацыяй і каардынацыі сумесных дзеянняў былі створаны суполкі – “Простыя словы – 2015” (рэжым доступу: https://vk.com/club87945606), “Простыя словы – 2016” (рэжым доступу: https://vk.com/club112588101) і “Простыя словы–2017” (рэжым доступу: https://vk.com/club138780828) (малюнак 1).




**Малюнак 1.** Аватары суполак “Простыя словы” (2015–2017 гг.)

Неабходнасць у стварэнні такіх груп тлумачыцца патрэбай у арганізацыі дыстанцыйнага супрацоўніцтва паміж педагогамі і ўдзельнікамі вучэбна-трэніровачных збораў, у структуры якіх вылучаюцца два складнікі – прадметны і псіхалагічна-камунікацыйны. Першы з іх вызначаецца характарыстыкамі конкурсаў рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” (набор конкурсных выпрабаванняў традыцыйны для філалагічнай алімпіяды: комплексная работа па мове і літаратуры, пісьмовы водгук на прапанаваны тэкст і вуснае выказванне па пэўнай тэме). Псіхалагічна-камунікацыйны складнік зместу забяспечвае арганізацыю ўзаемадзеяння членаў групы і псіхалагічную падтрымку школьнікаў. Выкарыстанне суполак як адукацыйнай платформы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дазваляе дасягнуць патрэбнага выніку ў кожным з адзначаных кампанентаў зместу як на этапе падрыхтоўкі да алімпіяды, так і ў час яе непасрэднага правядзення.

Удзельнікамі суполкі з’яўляюцца адміністратар (трэнер каманды), мадэратары з ліку былых удзельнікаў алімпіяды, якія добраахвотна дапамагаюць у афармленні суполкі і напаўненні яе арыгінальным кантэнтам, звычайныя ўдзельнікі – вучні, а таксама педагогі (выкладчыкі на зборах, кіраўнікі каманды, настаўнікі асобных вучняў). Кожны з удзельнікаў мае магчымасць свабодна праглядаць усе матэрыялы, выкладваць свае навіны, дзяліцца фота- і відэаздымкамі, каменціраваць допісы іншых і г.д.

Першае заданне, якое прапануецца выканаць удзельнікам суполкі, – гэта распрацоўка прывітальнага паслання (прэзентацыйны тэкст + фота + аўдыёзапіс) (малюнак 2). Дзякуючы гэтаму заданню члены алімпіяднай каманды завочна знаёмяцца яшчэ да пачатку збораў, а трэнер атрымлівае магчымасць ацаніць развіццё маўленчых і камунікатыўных навыкаў школьнікаў. Далей, на зборах або пасля іх, у час алімпіяды, удзельнікі працягваюць размяшчэнне ў суполцы фотасправаздач з тэкставым каментарыем аб розных падзеях.




**Малюнак 2.** Узор прывітальнага паслання ўдзельніцы збораў на сцяне суполкі “Простыя словы-2016”

Асноўная частка інфармацыі праходзіць праз сцяну суполкі – усе публікацыі на ёй адлюстроўваюцца ў стужках навін удзельнікаў групы, што дазваляе хутка і эфектыўна распаўсюджваць або актуалізаваць патрэбную інфармацыю. Так, на сцяне “Простых слоў” з’яўляюцца звесткі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пра дзяржаўныя святы, памятныя даты, дні нараджэння беларускіх пісьменнікаў, адметныя падзеі ў культурным жыцці вобласці і краіны, змяшчаюцца цікавыя факты пра мастакоў слова і адметныя моўныя з'явы.

Суполка дае магчымасць арганізацыі інтэрактыўнага ўзаемадзеяння для актывізацыі ўдзельнікаў – гэтай мэце служаць апытанні і абмеркаванні. Так, у 2016–2017 гг. праводзіўся праект "Бітва афарызмаў": на сцяне штодня з'яўляліся аб'яднаныя пэўнай тэмай выслоўі, аднаму з якіх можна было аддаць свой голас (малюнак 3). Такая праца садзейнічала пашырэнню кругагляду школьнікаў і фарміраванню ў іх запасу выслоўяў, якія можна працытаваць пры напісанні водгуку ці складанні вуснага выказвання. Апытанне выкарыстоўвалася і як сродак вызначэння пераможцаў у разнастайных конкурсах (напрыклад, на лепшы акраверш пра вясну ці сачыненне да Дня роднай мовы). Прыкладам абмеркавання можа служыць прысвечаны пытанням акцэнталогіі форум, на старонках якога вялася сумесная праца па складанні мнеманічных беларускамоўных формул.




**Малюнак 3.** Узоры апытання сярод удзельнікаў суполкі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1. Пасля завяршэння алімпіяды ўдзельнікі запаўняюць рэфлексійны ліст, дзе, сярод іншых, ёсць пытанне, датычнае суполкі ў сацыяльнай сетцы: “Ці лічыце вы патрэбным існаванне суполкі vkontakte «Простыя словы»? Для чаго?”. Прывядзём некалькі характэрных выказванняў вучняў пры адказе на гэта пытанне: *“Канешне-канешне, толькі ў нас ёсць такі вось камандны інтэрнэт-сусвецік, які натхняе кожны дзень”* (Вольга, 11 клас). *“Абавязкова, бо так мы не згубім сувязь паміж сабой і заўсёды будзем атрымліваць патрэбную інфармацыю своечасова”* (Лізавета, 9 клас). *“Хацелася б, каб дзейнасць у ёй не спынялася (#суполкажывi), бо я кожны дзень наведваю яе з надзеяй, што там з’явілася нешта цікавае”* (Наталля, 10 клас). *“Тактактак. Мы з Таняй яе па сто разоў на дзень абнаўляем ☺ Гэта суполка для душы. У ёй – наш алімпіядны сусвет”* (Арына, 9 клас).

Як бачым, удзельнікі станоўча ацэньваюць існаванне суполкі, адзначаюць важную ролю, якую яна выконвае як канал камунікацыі і крыніца атрымання цікавай, карыснай інфармацыі.

На нашу думку, выкарыстанне сацыяльных сетак дазваляе стварыць адукацыйную прастору, якая забяспечвае высокую ступень узаемадзеяння паміж навучэнцамі і выкладчыкамі. Вучэбная дзейнасць у такім выпадку не абмяжоўваецца аўдыторнымі заняткамі і забяспечвае бесперарыўнасць навучальнага працэсу, што спрыяе эфектыўнай падрыхтоўцы школьнікаў да рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры.

## Літаратура

1. Доўгаль, Д. А. Вучэбна-трэніровачныя зборы ў сістэме падрыхтоўкі школьнікаў да заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры / Д. А. Доўгаль // Современное образование: мировые тенденции и региональные аспекты : сб. статей II Междунар. науч.-практ. конф., Могилев, 2 декабря 2016 г. / редкол.: М. М. Жудро [и др.] ; под общ. ред. Т. И. Когачевской. – Могилев : МГОИРО, 2017. – С. 286–289.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова